УДК 947.6.«1917»

**І. М. Рыжанкоў**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# АКТЫВІЗАЦЫЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ ВЯСКОЎЦАЎ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ НА ЭТАПЕ РАЗГОРТВАННЯ ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

У артыкуле асвятляецца актывізацыя прадпрымальніцкай ініцыятывы вясковых жыхароў беларускіх губерняў з сакавіка па кастрычнік 1917 г. Аўтар адзначае, што ў сакавіку сітуацыя з забеспячэннем сельскагаспадарачай прадукцыяй фронту і горада некалькі палепшылася. Вясной 1917 г. сяляне Беларусі, агорнутыя шырокай агітацыйна-прапагандысцкай кампаніяй з боку новаабраных дзяржаўных структур і грамадска-палітычнымі сіламі, чула ставіліся да заклікаў прадаваць хлеб па «цвёрдых цэнах». Летам 1917 г. павялічваюцца тэмпы таемнага продажу сельгаспрадуктаў па высокіх цэнах, распаўсюджваецца вінакурэнне. Прынятыя Часовым урадам меры, накіраваныя на стымуляванне продажу дзяржаве хлеба, кардынальна сітуацыю не выправілі. Дэфіцыт фабрычна-завадскіх тавараў, інфляцыя, палітычная нестабільнасць дрэнным чынам адбіліся на стаўленні селяніна да патрэб армейцаў, гараджан і дзяржавы ў цэлым.

**Ключавыя словы:** рэвалюцыя, «цвёрдыя цэны», вінакурэнне, аграрнае пытанне, рэквізіцыі, дэфіцыт.

**I. M. Ryzhankou**
Belarusian State Technological University

# REVITALIZATION BUSINESS INITIATIVE VILLAGERS BELARUSIAN PROVINCES ON THE STAGE THE DEPLOYMENT OF THE FEBRUARY REVOLUTION

The article highlights actively entrepreneurial initiative of rural inhabitants Belarusian provinces from March to October 1917. The Author notes that in March 1917 the provision of rural-Gospodarczy production front and the city a few palep were. In the spring of 1917 the peasants of Belarus is shrouded in a public outreach campaign from novourania state structures and socio-political forces heard belonged to appeals to sell bread at "fixed prices". In the summer of 1917 increased the secret sale of agricultural products at high prices, is distributed wakaranai. Passed by the Provisional government measures aimed at stimulating sales to the state of bread drastic the situation is not corrected. The shortage of factory goods, inflation, political instability bad impact on the relation of the peasant to the needs of the army, citizens and the state completely.

**Key words:** revolution, "rigid prices", vakarine, the agrarian question, requisition, shortage.

**Уводзіны.** Праблема жыццядзейнасці вясковых жыхароў, а таксама харчовае забеспячэнне фронту і горада ў гады Першай сусветнай вайны і міжрэвалюцыйнага перыяду не трапіла ў лік прыярытэтных распрацовак гісторыкаў савецкага перыяду.

У 20–30 гг. ХХ ст. у мемуарах Я. С. Канчара, Ф. Ф. Турука, В. Г. Кнорына, А. Р. Чарвякова, А. С. Славінскага і іншых былі закладзены асновы канцэпцыі развіцця рэвалюцыі на Беларусі і ролі ў ёй сялянства. Сялянская тэматыка раскрываецца фрагментарна ў кантэксце класавай барацьбы, антыўрадавай дзейнасці, асуджэння апанентаў бальшавікоў, сялянская гаспадарка ацэньваецца як адсталая. Між тым змястоўна асвятляецца дзейнасць салдат – рэвалюцыйнай, на іх думку, сілы. У ліку прац таго часу вылучаецца манаграфія дырэктара Кан'юнктурнага інстытута пры Наркамаце фінансаў СССР М. Д. Кандрацьева «Рынок хлебов и его регулирование во время войны и революции», дзе змешчаны аналітычны агляд з табліцамі па хлебных культурах у 1914–1918 гг., руху цэн на прадукты па Расіі.

У першае дзесяцігоддзе заканчэння Вялікай Айчыннай вайны вывучэнне гісторыі Беларусі 1917 г. запаволілася і больш ідэалагізавалася. Хрушчоўская «адліга» спрыяльна паўплывала на развіццё гістарычнай навукі, у тым ліку па сялянскай тэматыцы. З'явіліся працы Ф. А. Зеляноўскага, Е. П. Лук'янава, І. Я. Марчанкі, А. М. Анфімава, П. В. Валабуева, Л. П. Ліпінскага. Узбагацілі айчынную гістарыяграфію новыя падыходы, адлюстраваныя ў манаграфіі І. М. Ігнаценкі. У 80-я гг. навукоўцы пазнаёміліся з манаграфіяй Т. М. Кітанінай «Война, хлеб и революция».

У савецкі перыяд абагульняючая праца па жыццядзейнасці сялянства Беларусі так і не з'явілася. Былі пакінуты без агляду актуальныя

тэмы лютага: настроі і паводзіны сялянства ў першыя месяцы рэвалюцыі, стварэнне рознагаліновых камітэтаў, урадавых камісарыятаў і выбары земстваў, рэалізацыя аграрнай і харчовай палітыкі Часовага ўрада і выканання нарыхтоўчых нарадаў, збор сродкаў на карысць арміі і падпіска на Пазыку Свабоды, эканамічнае становішча вяскоўцаў, разгортванне таемнага вінакурэння і продажу сельскагаспадарчых прадуктаў, узаемаадносіны сялянства з гараджанамі, франтавікамі, батракамі, асвета, духоўнае жыццё і інш.

У найноўшай гісторыі Беларусі жыццядзейнасць вяскоўцаў па сакавік 1917 г. асветлена са старых пазіцый І. М. Ігнаценкі ў калектыўным творы «Гісторыі сялянства Беларусі». Пэўныя намаганні прадпрыняты шэрагам іншых айчынных даследчыкаў [1, 2, 3].

**Асноўная частка.** Часовы камітэт пры Дзяржаўнай думе на чале з М. У. Радзянка, а затым Часовы ўрад з Г. Я. Львовым разумелі небяспечнасць чарговых харчовых выступленняў для рэалізацыі праектаў новаўтворанай дзяржавы (скліканне Устаноўчага сходу, перамога ў вайне, дэмакратычнае абнаўленне і інш.).

У першыя месяцы Лютаўскай рэвалюцыі пры падтрымцы «рэвалюцыйнай дэмакратыі» ўрад прыняў шэраг сур’ёзных захадаў, накіраваных на барацьбу з вінакурэннем, таемным продажам сельскагаспадарчых прадуктаў, стабільнае паступленне хлебных прадуктаў у армію і горад. Прыняты меры і пастановы: 1 сакавіка – «Аб рэквізіцыі хлебных запасаў ва уладальнікаў, якія маюць не менш 50 дзесяцін ворыва», 3 сакавіка – заснаванне харчовых камітэтаў (з правам уліку сельскагаспадарчай прадукцыі, правядзення рэквізіцый, усталявання норм спажывання і тэрмінаў збору ўраджаю, размеркавання пайкоў, барацьба са скупшчыкамі), 25 сакавіка – увядзенне дзяржаўнай манаполіі на хлебныя запасы і ўраджай 1917 г. (увядзенне крымінальнай адказнасці за ўкрыццё хлеба і інш.), 11 красавіка – «Аб ахове пасеваў» (права на арэнду зямель, якія пуставалі) і ўвядзенне крымінальнай адказнасці за продаж спіртовых напояў (да 1 года турэмнага зняволення).

Да гарадскога насельніцтва неакупаванай Беларусі звесткі аб рэвалюцыйных падзеях у Петраградзе трапілі з мясцовых і сталічных газет. У першыя дні рэвалюцыі новапрызначаныя губернскія камісары (Б. М. Самойленка, Ф. Я. Хамянтоўскі, М. Л. Карташоў, В. С. Балай) і рэлігійныя дзеячы (упраўляючы Магілёўскай Архіепархіяй епіскап І. Цэпляк, Епіскап Слуцкі Феафілакт) звярнуліся да гарадскога і сельскага насельніцтва з тлумачэннямі значнасці петраградскіх падзей для народа і заклікам захоўваць парадак, не прыпыняць хлебныя пастаўкі фронту.

У сакавіку – красавіку 1917 г. падобныя адозвы і пастановы Часовага ўрада, губернскіх камісараў на павятовым і валасных ўзроўнях былі агучаны на мітынгах, шэсцях, царкоўных малебнах, паніхідах, арганізаваных дзяржаўнымі і грамадска-палітычнымі сіламі. У выніку сходы вяскоўцаў актыўна дасылаюць свае рашэнні аб «шчырым вітанні» новага ладу і гатоўнасці пастаўляць хлеб.

Так, Ерамічаскі валасны сход, выслухаўшы маніфест аб адмове ад трона Мікалая І, пастанавіў: «перайсці да новага ўраду… сярод нас і насельніцтва воласці захаваць цішыню і супакой, а для задавальнення вайны да пераможнага канца асыгнаваць з сум мірскіх запасных грошаў трыста рублёў і для бяспекі нашай арміі і тыла ахвяраваць хлеба ў зерне па 2 пуда з кожнага поўнага ўчастка» [4]. Паводле «Русского слова» ад 23 сакавіка, сяляне валасцей Гавезнянскай, Пацейкоўскай і Целядовічаскай ахвяравалі на патрэбы дзеючай арміі 1166 пудоў жыта.

Тлумачальная кампанія прынесла свае станоўчыя вынікі. У сакавіку – красавіку цэны на прадукты харчавання прыпынілі свой імклівы рост і нават у некаторых месцах панізіліся. Так, на старонках «Мінскага голасу» 11 і 13 сакавіка адзначалася, што ў Гомелі і Мінску «Цэны на муку і іншыя прадукты панізіліся на 50 працэнтаў, падвоз зерня і мукі з паветаў значна ўзмацніўся». У артыкуле ад 20 сакавіка адзначалася, што ў Мінску «цэны на цукар панізіліся з 30–32 руб. да 25 руб. за пуд… прычына жах гандляроў адказнасці за ўтойванне запасаў і рэквізіцыя».

Газета «Могилевский вестник» ад 17 сакавіка адзначае: «У Горках цана на хлеб панізілася да 8 кап. за фунт… У Магілёве замест мінулых 15, чорны хлеб прадаецца зараз па 11–12 кап. за фунт… масла – 50 кап. за фунт. На мяса цэны трымаюцца».

Паводле пастановы ад 25 сакавіка, для хлябоў ураджаю 1916 г. былі ўсталяваны наступныя цэны: жыта для Магілёўскай і Віцебскай губерняў – 2 руб. 65 кап., Мінскай – 2 руб. 70 кап.; пшаніца для Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай – 3 руб. 35 кап.; авёс для Магілёўскай, Віцебскай – 2 руб. 65 кап.; ячмень для Магілёўскай – 2 руб. 35 кап., Віцебскай і Мінскай – 2 руб. 40 кап.; грачыха для Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай – 3 руб. 35 кап.; проса для Магілёўскай – 2 руб. 90 кап., Мінскай, Віцебскай – 2 руб. 95 кап.; гарох для Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай – 3 руб. 30 кап.

Вясной 1917 г. у справаздачах урадавых структур, на старонках газет зрэдку трапляліся паведамленні аб шпаркім росце цэн на сельгаспрадукты, таемным продажы хлеба па завышаных цэнах або вінакурэнні. Вынікі хлебных

збораў вясной 1917 г. надалі ўпэўненасць міністру земляробства Шынгарову А. І. заявіць пра тое, што ў гарадах і на фронце няма падстаў баяцца сур'ёзнага крызісу.

Па Магілёўшчыне рыначныя цэны на сельгаспрадукты з лютага па красавік змяніліся наступным чынам і наблізіліся да зацверджаных дзяржаўнымі структурамі: жыта (1 пуд) з 4 руб. 31 кап. да 3 руб. 61 кап., ячмень 3 руб. 94 кап. – 3 руб. 67 кап., авёс 3 руб. 19 кап. – 3 руб. 33 кап., грачыха 4 руб. 92 кап. – 4 руб. 32 кап.; жытняя мука 5 руб. 24 кап. – 4 руб. 43 кап.; каровіна масла (1 фунт) з 2 руб. 72 кап. да 2 руб. 09 кап.; малако (1 вядро) з 4 руб. 15 кап. да 3 руб. 59 кап. [5]. Пад Вялікдзень цэны на яйкі і муку традыцыйна павысіліся.

Адчувальны недахоп з забеспячэннем прадуктамі харчавання фронту і горада стаў вызначацца з канца чэрвеня 1917 г. Звязана гэта з пэўнымі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі абставінамі: зменай кабінетаў Часовага ўрада, абвастрэннем палітычнай сітуацыі, пагаршэннем сітуацыі на фронце, слабым кантролем з боку міліцыі, ростам цэн на хлеб і яго дэфіцытам на вёсцы, пашырэннем перагонкі зерня на спірт і продажам у далейшым салдатам і гараджанам, неадпаведнасцю «цвёрдых цэн» рыначным, дрэнным забеспячэннем вёскі фабрычна-завадскімі таварамі, неапраўданымі надзеямі на паскоранае вырашэнне набалелых праблем (аграрнае пытанне).

Варта азначыць, што пуд жыта харчовыя камітэты набывалі ў сялян па 2 руб. 70 кап., а прадавалі па 3 руб. 85 кап. У той самы час сялянскія ахвяраванні для фронту працягваліся.

Харчовыя камітэты губернскага, павятовага і валаснога ўзроўню пры падтрымцы Саветаў дэпататаў прымаюць рэзалюцыі аб строгім уліку і абмежаванні запасаў хлеба (жыта, пшаніца, полба, проса, чачавіца, фасоль і гарох, кукуруза, ячмень і авёс, усякага роду мука, вотруб'е, крупы) для пракармлення да новага ўраджаю, перадачы ў загадванне харчовым камітэтам хлебных запасаў прыватных уладальнікаў і рэквізіцыі ўтойваемага хлеба за палову ад «цвёрдай цаны» і турэмным заключэнні за вінакурэнне [6].

У такіх умовах сяляне імкнуліся скарыстаць сітуацыю на сваю карысць і актыўна ўключыліся ў продаж па рыначных цэнах сваёй прадукцыі і вінакурэнне.

Паказальны артыкул карэспандэнта газеты «Новое Варшавское утро» І. Волка ад 3 жніўня пад назвай «В Полесской деревне». «У той час калі ў Петраградзе і Маскве ўсе крычаць аб голадзе, а яйкі прадаюцца па 98 коп. за дзес. (Петраград) і фунт пшанічнага хлеба каштуе 30–35 капеек у нас у Палесі, яйкі каштуюць летам ад 1 р. 10 к. да 1 р. 50 коп. за дзес., а фунт дрэннага пшанічнага хлеба 50–60 кап. касцы за 8 гадзін рабочага дня бяруць па 12–15 рублёў».

Затым паведамляецца, што сялянін «неахвотна растаецца з запасамі прадуктаў, дакладна разумея, што далей яны спатрэбяцца ім больш... Нядаўна ў Мінскім павеце сгарэла ў розных асоб, некалькі дзесяткі тысяч рублёў зберажэнняў. Сяляне займаюцца вывазам (бярвенняў) на лесапілку Усерасійскага земскага саюза ў с. Дзяніскавічах (Слуцкага павета Мінскай губерні) і маюць на паракопнай падвозе да 400–600 руб. чыстага прыбытка ў месяц. Зараз нават ад "замухрышкі" – палешука паказвая яму 100 рублёўку нярэдка чуеш пагардліва "Да хіба ж гэта сёння грошы!"».

Рост цэн і сялянскіх апетытаў у Магілёве прасочваецца ў газеце «Могилевская жизнь» ад 21 ліпеня, 20 жніўня і 28 верасня. Так, у ліпені гарлач смятаны каштаваў 1 руб. 50 кап., у верасні ўжо 2 руб. 50 кап., кураня 3 руб. – адпаведна 9–10 руб. Таму, зразумела, на старонках перыдычных выданняў сустракаліся паведамленні пра «спекуляцыйны разгул», «эпідэмію нажывы», якія панавалі ў горадзе і на вёсцы.

«Горад і мястэчкі літаральна жывуць у прагаладзь; галадаюць малазямельныя сяляне. Вольныя цэны на хлеб павысіліся да 10–12 руб. за пуд, але і за гэту цану не знайсці хлеба, сусед не прадае. Хлеб харчовым камітэтам не дае, а хавае… узяць хлеб у селяніна можна толькі сілай» [7].

Пра паскораны рост сялянскіх грашовых дэпазітаў у ашчадных касах паведамлялася на старонках «Могилевской жизни» ад 6 жніўня.

4 жніўня Віцебская гарадская харчовая управа паведамляла губернскай аб тым, што «штодня трапляюць скаргі з боку гарадского насельніцтва на сялян, якія прывозяць малочныя прадукты і другія прадукты для продажу ў горад і патрабуючых за іх неймаверна высокія цэны пры чым япошнія з кожным днём па жаданню асобных сялян павялічваюцца, гарадское насельніцтва ў зусім безвыходным палажэнні, таму шта пры высокай цане на мяса малочныя прадукты з'яўляюцца адным з галоўных прадметаў спажывання... гэта вакханалія… просьба разгледзіць на пасяджэнні губернскага харчовага камітэта».

У такіх умовах прадпрымальніцкая ініцыятыва сялян актывізавалася. Каб зарабіць у гэты складаны час, сяляне Мошканскай воласці набывалі хлеб па 7–8 руб. за пуд і прадавалі ў Віцебску за 15 руб. за пуд [8].

Павышэнне 29 жніўня ўдвая «цвёрдай цаны» на збожжа прынцыпова не выправіла сітуацыю, бо не паспявала за прапановамі рынку. 10 верасня старшыня Магілёўскага губернскага

харчовага камітэта Мусерскі І. М. на чарговым пасяджэнні выступіў з разгорнутым дакладам – пра недарод жыта, нежаданне вёскі «аддаваць хлеб гораду», актывізацыю «сялян-спекулянтаў», якія прадавалі па «цвёрдых цэнах», каб потым прасіць больш танны хлеб у харчовай управе. Па яго сведчанні, сяляне захоўвалі частку запасаў для далейшага вывазу за межы губерні і продажу па 20 руб. або «для самагонкі» [9]. Старшыня з гараччу канстатаваў, што харчовая ўправа не мае права распараджацца фабрычна-завадскімі таварамі для забеспячэння вяскоўцаў.

З лета 1917 г. разгортваецца тайнае вінакурэнне для продажу вайскоўцам і гараджанам. Мясцовыя грамадска-палітычныя і адміністрацыйныя структуры прымалі пастановы з асуджэннем вінакурэння, арганізоўвалі міліцэйскія і грамадскія патрулі, пазбаўлялі «самакураў» хлебнага пайка і фабрычна-завадскіх тавараў. Прынятыя меры не здолелі карэнным чынам змяніць сітуацыю.

На пасяджэнні Віцебскага губернскага сялянскага з'езда адзначалася: «…ёсць і яшчэ адно зло: амаль ва ўсякім восеці ладкаваны маленькі вінакурны завод. Самагонкай гандлююць па 40–60 руб. чвэрць. Для чвэрці неабходна пуд хлеба. Карысна. Няма агульнай свядомасці. Сваім выбарным не давяраюць. Наогул мала ўзаемнага даверу і шмат зайздрасці і асобых інтарэсаў» [10].

На старонках газет прыфрантавой паласы сустракаліся абураныя артыкулы пра распаўсюджанне «ханжы» і «самагонкі». Так, у газеце «Новое Варшавское утро» ад 30 жніўня з абурэннем адзначалася: «…у прыфрантавых губернях і гарадох моцна квітнее варэнне "самагонкі" і ачыстка дэнатураванага спірта… Збытам жа гэтага прадукта займаюцца "чайныя" і "кавярні". "Крысталізацыя" – першы сорт цэніцца па 28 руб. за бутылку. "Самагонка" – 2 гатунак ад 8 – да 20 руб. за бут., "ханжа" нізкай пробы каштуе 5 руб. У попыце "спірт" 90° – 50 руб. шклянка. Па словах свабоднага вінакура, шклянка "самагонкі" і "ханжы" абыходзіцца не больш 2 руб.».

З пашырэннем дэмакратычных свабод у арміі і аслабленнем вайсковай дысцыпліны спажываць і рэалізоўваць самагонку пачалі франтавікі, салдаты-дэзерціры. Так, 8 верасня член управы Казьянскага валаснога харчовага камітэта Клімаў затрымаў і склаў пратакол за бочачку самагону на салдата П. Данілава з вёскі Карысці [11].

У верасні Віленскі губернскі камісар В. С. Балай у дакладной запісцы ахарактарызаваў мясцовага селяніна як чалавека, які з павагай ставіцца да парадку, мае моцную волю, валодае цярпеннем і жыццёвай хітрасцю, разумее свабоду як права на зямлю.

У кастрычніку сітуацыя з забеспячэннем сельскагаспадарчымі прадуктамі яшчэ больш пагоршалася і вырашэнне гэтай праблемы чакала іншых больш актыўных мерапрыемстваў. У гэты час кошт хлеба па Полацкім павеце дасягнуў 30 руб. за пуд [12].

На Магілёўшчыне пуд жыта каштаваў 19 руб. 99 кап. Таксама Віцебскаму губернскаму камісару паведамлялі аб цяжкім харчовым становішчы ў Дзвінскім павеце. Падобная складаная сітуацыя сустракалася практычна ва ўсіх паветах беларускіх губерняў.

**Заключэнне.** З лютага сялянства Беларусі, як і ў цэлым па Расіі, было актыўна ўключана ў грамадска-палітычнае жыццё дзяржавы. Арганізавана вяскоўцы віталі на маніфістацыях, мітынгах, малебнах новы дзяржаўны лад і ўдзельнічалі ў выбарах новых органаў кіравання, рознагаліновых камітэтаў (харчовых, зямельных), дэмакратычных земстваў. Гэта пашырала кругагляд, стымулявала ініцыятыву, самастойнасць. Таксама новыя ўмовы часу і абвостраныя старыя хваробы (дэфіцыт, дарагоўля, пашыраны попыт на рабочыя рукі, прадукты харчавання і інш.) актывізавалі дзелавыя і іншыя асабістыя якасці вяскоўцаў.

Дзяржаўныя і грамадскія сілы пераацанілі значнасць дэмакратычных рэформаў для сялянскай масы, не задаволілі іх гаспадарчыя патрэбы і ў першую чаргу не апраўдалі чаканні па зямельным пытанні. Сялянства вырашыла скарыстаць момант аслаблення дзяржаўнага кантролю для паляпшэння свайго эканамічнага стану.

У выніку адбылося несупадзенне інтарэсаў агульнаграмадскіх і агульнадзяржаўных з вузкакарпаратыўнымі сялянскімі. У той самы час вяскоўцы да самага пачатку новай рэвалюцыі працягвалі ахвяраваць арміі.

## Літаратура

1. Семенчик Н. Е. Сельское хозяйство и промышленность Беларуси времен Первой мировой войны в отечественной историографии // Труды БГТУ. 2016. № 5: История, философия, филология. С. 19–23.

2. Семенчик Н. Е. Революции 1917 г. и их последствия в Беларуси // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2017. № 1. С. 47–52.

3. Рыжанкоў І. М. Харчовая палітыка Часовага ўрада ў Беларусі (верасень – кастрычнік 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2017. № 1. С. 53–57.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 60. Воп. 3. Спр. 242. Арк. 40.
5. Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. Інвентарны № 1181. Цэны на галоўныя прадукты і прадметы сельскай гаспадаркі ў Магілёўскай губерні за 1917 г. С. 5–6.
6. НАРБ. Фонд 624. Воп. 1. Спр. 59. Арк. 72.
7. По губернии // Могилевская жизнь. 1917. 25 августа. С. 3–4.
8. НАРБ. Фонд 624. Воп. 1. Спр. 59. Арк. 131.
9. В губернском продовольственном комитете // Могилевская жизнь. 1917. 20 сентября. С. 2.
10. Губернский крестьянский съезд // Витебский листок. 1917. 13 июня. С. 2.
11. НАРБ. Фонд 624. Воп. 1. Спр. 7. Арк. 136.
12. По губернии // Витебский листок. 1917. 12 октября. С. 1.

## References

1. Semenchyk M. Ye. Agriculture and industry of Belarus during the First world war in the national historiography. *Trudy BGTU* [Proceeding of BSTU], 2016, no. 5: History, philosophy, philology, pp. 19–23 (In Russian).
2. Syamenchyk M. Ye. The revolution of 1917 and their consequences in Belarus. *Trudy BGTU* [Proceeding of BSTU], series 6, History philosophy, 2017, no. 1, pp. 47–52 (In Russian).
3. Ryzhankou I. M. Food policy of the Provisional government in Russia (september – october 1917). *Trudy BGTU* [Proceeding of BSTU], series 6, History, philosophy, 2017, no. 1, pp. 53–57 (In Belarusian).
4. National Archives of the Republic of Belarus (NARB). Fund 60. I. 3. F. 242. L. 40.
5. State archives of Mogilev region. Inventory No. 1181. Prices on main products and items for agriculture in the Mogilev province for 1917, pp. 5–6.
6. NARB. Fund 624. I.1. F. 59. L. 72.
7. In the province. *Mogilevskaya zhizn'* [Mogilev life], 1917, 25 August, pp. 3–4.
8. NARB. Fund 624. I. 59. F. 59. L. 131.
9. In the provincial food Committee. *Mogilevskaya zhizn'* [Mogilev life], 1917, 25 September, p. 2.
10. Provincial peasant Congress. *Vitebskiy listok* [Vitebsk leaf], 1917, 13 June, p. 2.
11. NARB. Found 640. I.1. F. 7. L. 136.
12. In the province. *Vitebskiy listok* [Vitebsk leaf], 1917, 12 October, p. 1.

## Інфармацыя пра аўтара

**Рыжанкоў Ігар Міхайлавіч** − кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: im@belstu.by

## Information about the author

**Ryzhankou Ihar Mikhaylavich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: im@belstu.by

*Паступіў 23.03.2018*